Беларускі Звон

ТЫДНЁВАЯ ЧАСОПІСЬ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9). Рэдакцыя адчынена: 12—2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Рукапісы павінны быць напісаныя чытэльна і толькі на адным баку паперы, з прозьвішчам аўтара і адрасам для ведама Рэдакцыі. Нязручныя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана кожнага нумару 50 м. Падпіска на 3 месяцы каштуе 600 м. (з дастаўкай да хаты). Цана абвестак: перад тэкстам 200 мк., ўслед тэксту 30° мк. і на апошняй страніцы 120 мк. за радок петыту у 1 шпальт.

Год II. Вільня, Субота, 23-га верасьня 1922 г. № 21 (46).

ГРАМАДЗЯНЕ! Аб кожным нарушэньні адміністрацыяй свабоды выбарнае агітацыі, аб кожным арышце за перадвыбарную агітацыю, аб нявыдачы дакумэнтаў і другіх нарушэньнях закону ураз-жа паведамляйце на пісьме Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт у Вільні (Віленская вуліца дом № 12, кв. 6), або свой беларускі павятовы ці акружны камітэт—найлепш не праз пошту, а праз пасланца.

Правы і павіннасьці.

Часта можна пачуць ад беларусаў, якія нядаўна былі несьвядомымі, а цяпер пазнаёміліся з беларускім рухам, часта можна пачуць ад іх нараканьне на тое, што ў руху дужа мала зроблена.

Інтэлігент, ахвотнік да чытаньня, які нядаўна яшчэ быў несьвядомым русыфікатарам ці полёнізатарам, наракае, што мала кніжак ёсьць на беларускай мове.

Чалавек, які дагэтуль ня толькі ламанага граша не патраціў на беларускую справу, але ня быў падпішчыкам ніводнай беларускай газэты, наракае, чаму няма для яго вялікай штодзеннай газэты на беларускай мове.

Сьвяшчэньнік, які дагэтуль быў несьвядомым працаўнікам беларускага руху, наракае, што беларускія арганізацыі ня могуць абараніць царкву ад захвату яе на касьцёл.

Каталік парахвіянін, які дагэтуль слова не сказаў за беларускі рух, наракае, чаму ў іхным касьцёле няма яшчэ казаньняў пабеларуску.

Канцэлярыста, які дагэтуль упорчыва не хацеў навучыцца пісаць пабеларуску, застаўшыся цяпер безработным, наракае, чаму беларусы ня могуць даць яму канцэлярскай службы.

Вучыцель, які дагэтуль прызнаваў толькі расейскую школу і тым самым ужо ў гарачы для нас арганізацыйны школьны час перашкаджаў адкрыцьцю беларускіх школ, наракае цяпер, чаму беларусы ня могуць адкрыць для яго беларускай школы.

Салдат, які ў час магчымасьці стварэньня беларускага войска, спаў у шапку, наракае цяпер, чаму няма асобных беларускіх частак, бо яму цяжка служыць у польскіх вайсковых частках.

Урэшце, селянін, які дагэтуль толькі чакаў, што яму няма ведама хто нарэжа панскай зямлі, наракае цяпер на беларускіх кіраўнікоў, чаму ў яго спад носу тая зямелька трапляе ў рукі паляка-колёнізатара.

І гэтак далей, і гэтак далей.

Найбольш наракаюць, аднак, ня [illegible]остыя цямнейшыя людзі, а беларускія інтэлігенты, якія ў свой час мусілі працаваць для справы, а яны ў лепшым выпадку нічога не рабілі, а ў горшым—сваёй несьвядомасьцю навет заміналі рабіць другім.

Ім можна было-б сказаць цяпер словамі нашага вялікага песьняра Янкі Купалы:

> А што-ж дагэтуль вы рабілі?
> А дзе-ж дагэтуль вы былі?

Але ня трэба гэтак казаць, бо ніякімі спрэчкамі ці нараканьнямі рады цяпер не дасі. Балазе людзі, хоць позна, але ўзьбіліся на свой шлях. Балазе ж нацыянальна-соцыяльнае ўсьведамленьне беларускае разьліваецца цяпер па ўсей бацькаўшчыне неспадзявана шырокімі хвалямі. Кажу: неспадзявана, бо шмат ёсьць сярод іх так наракаючых цяпер, такіх людзей, што трудна ўжо было й спадзявацца, што яны некалі скончуць свой сон, што яны некалі прачнуцца беларусамі і сьвядомымі грамадзянамі.

Толькі-ж ізноў не сядзіце склаўшы рукі. Толькі ж бярыцеся ўжо за працу па сваіх здольнасьцях, па сваёй магчымасьці.

Глядзіце: надыходзяць выбары ў Варшаўскі Соймі Сэнат. Паны сабралі вялізарныя грошы на агітацыю, каб выбраць сваіх людзей. Аблажылі сябе складкамі па тысячах марак з дзесяціны. Пусьцілі на вёску агітатараў на аўтамабілях, з цэлымі пудамі сваіх газэт, кніжак, праклямацый. Націскаюць, дзе толькі можна, і ласкаю і пастрашкаю, задурываюць нашага селяніна ўсякім спосабам. А колькі-ж у іх руках рознага начальства!

І здаецца: прапала наша справа. Адкуль мы возьмем грошы на тыя аўтамабілі, кніжкі й газэты, на тыя пачастункі падкіх на салодкае людзей, на тых агітатараў, навет на тое, каб памагчы сваім людзём, якія ходзяць па самай патрэбнай выбарнай справе, траціць час, каб хоць, ну, схадзіць пажаліцца, што нашы газэты не даходзяць ні ў Вялейку, ні ў Глыбокае, ні яшчэ куды?

Так здаецца.. Але нам-жа ў тысячу разоў лягчэй было-б навярнуць людзей на свае сьпіскі, чым паном, калі-б толькі кожны з нас рабіў усё залежнае ад свайго жаданьня і ад свае спасобнасьці.

Бо з нашага боку права і справядлівасьць, з нашага боку ўжо тое, што мы не паны, што мы народ, што нас многа і ўсе мы пакрыўджаныя.

Мы-ж можам, ня езьдзячы на аўтамабілях, расказаць усё свайму народу, раз'ясьніць яму, што такое выбары, дзеля чаго і за каго трэба галасаваць і чаму канешне, абавязкова трэба галасаваць.

Вы, усе, хто наракае! Бываеце ў Вільні, захадзіце ў Беларускі Выбарны Камітэт на Віленскай вуліцы, № 12, налева ў падворку. Бярыце там выбарную літаратуру, газэты, адозвы і вязіце народу. Не самі едзеце, накажыце зайсьці і ўзяць чалавеку, які едзе ў Вільню, ці па тавары, ці ў каапэратыў, ці дзяцей у школу вязе, ці яшчэ па якой справе. Ня дойдзе вам газэта па пошце, дык яе і прывязе з сабою гэты чалавек.

Вы ўсе хто наракае! Падыйдзіце к цёмнаму чалавеку, які толькі на рынку, ці ў млыне, ці ў кузьні, чуў нешта нейкае аб выбарах, і аб'ясьніце яму ўсё так, каб ён ведаў, каб ён пайшоў падаць свой голас за беларускі сьпісак. Вы сьвятлейшы за другога, дык вы павінны дапільнаваць, каб гэтага цямнейшага запісалі ў сьпіскі выбаршчыкаў, каб ён ня лішыўся дзеля цемнаты свайго права падаваць голас.

Вам-жа ня трэба ехаць далёка на аўтамабілі, бо гэты чалавек жыве з вамі побач.

Будзьце сьмялейшымі, адкіньце нашу праклятую соцыяльную нясьмеласьць, бо іначай вы ўзноў будзеце наракаць, хіба з тою толькі розьніцай што дагэтуль вы стагналі, а далей завыеце ад бяды ваўкамі...

Дзе трэба, будзьце „кроткі як галубы, і хітры, як зьмеі".

Нікому не салодка лезьці на ражон і рызыкаваць і сваім спакоем, і здароўем. Але сорамна сядзець злажыўшы рукі, калі другія ня толькі для сваей, але й для вашай-жа карысьці, ўжо згубілі і гэты спакой і гэтае здароўе, Мусіце рабіць тое, што можна рабіць.

Калі мы ўсе дружна, як мурашкі, возьмемся за справу; калі мы, хоць як краты, станем дружна тачыць, дзе толькі можна, — дык ня прыдзецца наракаць, чаму ў беларусаў няма таго а таго, чаму беларусу баліць тое а тое.

Глаўнае, ня верце ніякім самым добрым, самым найлепшым панам і іхным паслугачым. Ня верце самай лепшай партыі, калі яна суліць цяпер залатыя горы, а сама ў цяперашнім Варшаўскім Сойме галасавала, каб належачыя вам землі засяліць польскімі колёнізатарамі.

Яны цяпер загаварылі з вамі і пабеларуску, і навет парасейску. Ня верце ваўкам ў авечай скуры. Бойцеся іх, як чумы, як халеры, як найзьлейшых вашых ворагаў, бо прытоеных.

Помніце, што цяпер у нашым краі няма ніводнай лепшай для вас партыі, як левыя беларускія партыі, увайшоўшыя ў Беларускі Выбарны Камітэт.

Помніце, што кожны, хто цяпер папрацуе, каб выбраць у Варшаўскі Сойм добрых беларускіх паслоў, толькі той будзе мець права вымагаць сабе ад беларусаў і помачы, і абароны і падтрыманьня.

Добра вазьміце сабе гэтыя словы ў дум, бо зьбіраецеся жыць ня толькі сягоньня, але й заўтра.

Той, хто дагэтуль ўсё яшчэ толькі чакаў нейкай манны нябеснай няведама скуль, ці толькі наракаў на беларускі рух, хай цяпер добра возьме ў дум, што манна нябесная і заўтра яму з неба ня зваліцца, а беларускі рух набіраецца і будзе набірацца сілы й заўтра й пасьлязаўтра.

І каб заўтра мець хоць нейкае права гаварыць аб сваіх правох, належачых ад гэтага руху, трэба сяньня заслужыць іх.

N.

Гутарка да братоў беларусаў.

Дарагія браты! Скора будуць выбары паслоў у Варшаўскі Сойм. Ужо цэлае табала розных агітатараў езьдзіць па нашым краі. Кожны агітатар стараецца намовіць нас, каб галасавалі за яго партыю. Дайшло да таго, што навет многія агітатары-палякі загаманілі з намі нашым родным словам, ці як яны кажу[illegible] — папросту, а даўней казалі, што памужыцку ці пахамску. Гэтак і з даўных часоў было: як царскі чыноўнік ці польскі пан хацеў лаўчэй пад'ехаць пад нашага брата, дык пачынаў гаварыць папросту. Якраз дзеля таго цяпер гавораць з намі пабеларуску многія польскія агітатары, каторыя толькі год ці два раней сьмяяліся з нас і з нашага языка.

І ўжо цёмнаму чалавеку трудна разьбірацца, дзе свой брат, а дзе во[illegible]к у авечай скуры.

Хто іх ведае, дзе былі гэтыя агітатары тады, калі мы прыкладам прасілі школы, а нам яе не давалі., ці адчыненую намі зачынялі. Калі мы хацелі выбраць войтам свайго чалавека, а нам садзілі на шыю другога. Ды і ці мала тых балячак, аб якіх няможна сказаць.

Цяпер, калі агітатары ад паноў ужо не спадзяюцца абдурыць беларускага мужыка, зьявіліся яшчэ хітрэйшыя, каторыя нам і зямлю суляць, і ўсякія правы, і школу, і роўнасьць ува ўсім. Чаму хітрыя ваўкі ў авечай скуры, якія загаварылі цяпер з намі панашаму, не спамінаюць, як нашы сапраўдныя працаўнікі стараліся ўсякай беларушчыны і палёгкі для народа, а гэтыя ваўкі зрабілі так, што і ўсе законы аб выбарах разьлеплены ў нас не пабеларуску, а па польску.

Пабеларуску мы і ня быўшы ў беларускай школе так-сяк раскумекалі-бы, а па польску, што мы зразумелі. Нам ня дзіва ашукацца, ня ведаючы, што і як трэба сапраўды рабіць?

Дык слухайце-ж, браты мае дарагія, беларускія мужыкі, што я вам тут скажу. Я стары беларус і пісаў карэспандэнцыі яшчэ ў першую газэту — „Нашу Ніву" з 1906 года.

Цяпер я быў у Вільні ў нашым Беларускім Выбарным Камітэце і гаманіў з усімі нашымі сапраўднымі людзьмі. Камітэт ужо паслаў па вёсках сваіх людзей, але многа пасланцаў ня мае спосабу і да ўсіх нас прамовіць яму нялёгка.

Мы павінны лавіць кожнае слова, якое скажа наш Беларускі Выбарны Камітэт. Мы павінны чакаць, пад якім нумаром выставіць ён сьпісак паслоў у Сойм і ўсе, як адзін, галасаваць за гэты наш сьпісак. Мы павінны дзяржаць вуха востра, каб не паддацца на вудачку другім агітатарам, як-бы ян[illegible] пер саладка не пялі.

Камітэт паставіць такіх пас[illegible]ў, якія будуць дабівацца ў Сойме толькі таго, чаго мы хочам і што нам патрэбна.

У Камітэце ёсьць такія людзі, як Антон Луцкевіч, што многа кніжак панапісываў для абеларускага народу, многа працы і здароўя паклаў за нашу справу, сядзеў у царскай турме, і у польскай турме, і у бальшавіцкай чрэзвычайцы, а ўсё бароначы ад напась-

Беларуская інтэлігенцыя, сяляне і работнікі, рыхтуйцеся да выбарау, трэбуйце, каб незапісаных запісывалі у сьпіскі выбаршчыкау!

цей свайго брата беларускага селяніна.

У Камітэце ёсьць такія людзі, як Міхал Кахановіч, што быў дырэктарам беларускай гімназіі ў Вільні і працаваў у Беларускай Школьнай Радзе і многа палажыў стараньня, каб мы свае школы на вёсках мелі.

У Камітэце ёсьць праваслаўныя сьвяшчэньнікі беларусы і ксяндзы-беларусы. Разумеецца, ня ўсіх нашых сьвяшчэньнікаў і ксяндзоў пахваліць можна. Некаторыя і ня дужа то народ любяць і сеюць звадкі ды сваркі між праваслаўнымі і каталікамі беларусамі. Але ў Камітэце такіх няма. У Камітэце ёсьць такія духаўнікі, што за беларушчыну і за сваю любоў да народу і за свае жойстрае слова і ў турме сядзелі. Досыць сказаць, што ў Камітэце працуець ксёндз Адам Станкевіч, сын селяніна з Ашмяншчыны, дастаўшы вышэйшую навуку. Яго многія з нас добра знаюць і ў Дзісеншчыне і ў Ашмяншчыне. Ен першы начаў казаць на вёсцы і ў Вільні ў касьцеле казаньні пабеларуску, ён быў рэдактарам газет для беларускага народу і шмат працы паклаў на помач уцекачом і пацярпеўшым ад вайны беларусам.

Беларускі Выбарны Камітэт выставіць у Сойм такіх пaслоў, якія будуць найперш дабівацца, каб усіх нас зямлёю панскаю і скарбоваю надзяліць, каб у нашым краі не аддаваць зямлі польскім каланістам, якія садзяцца тут заместа вялікіх паноў дробнымі панкамі. Яны будуць дабівацца, каб у гмінах нашы справядлівыя людзі сядзелі, каб усе паперы пабеларуску зразумела для нас пісаліся і прысылаліся, каб помач пацярпеўшым ад вайны давалі, а ня толькі бралі з нас, каб усякіх нягодных начальнікаў далоў, што крыўдзяць нас.

Паслы нашы аб усякай нам крыўдзе будуць заяўляць у Сойме, нікога, паляка ці не паляка, пана ці не пана не пакрываючы.

Важны час наступіў — гэтыя выбары.

Помніце, браты, што трэба скарыстаць, хаця з тых правоў, якія нам дадзены па польскіх законах. А законы гэтыя, у справе няпольскіх народнасьцей у Польшчы, пісаліся так, каб сумроць іх ня мела і Ліга Нацый.

А шырокі сьвет ня ведае, як нам жывецца. Па законах выходзе, што нам і дужа добра. Вось-жа нашы паслы, якіх мы здолеем выбраць, скажуць у Сойме ўсю праўду. Толькі трэба, каб іх выбраць. Нам трудна правесьці выбары добра, бо мы грошы на сваіх агітатараў ніадкуль не дастанем, бо мала пісьменныя, жывём аяз школ і без газэт. Дык трэба цесна згуртавацца каля сваіх людзей у нашым Беларускім Выбарным Камітэце і ісьці за імі сьцяною. Што яны скажуць, тое і рабіць. Разумеецца, трэба разьбірацца ў тым, што Камітэт кажаць, каб можна было быць пэўным у справядлівасьці і бараніцца ад нападак на яго і на ўсіх нас.

Ня слухайце ваўкоў у авечай скуры, яны ізноў вас ашукаюць, палезшы толькі вашымі галасамі ў Сойм. Усе галасы аддайце толькі свайму Беларускаму Выбарнаму Камітэту, ў ім людзі, якія век з намі жывуць, нікуды не ўцякуць і нас ня кінуць. Кожны ваш голас якой іншай партыі, а не Беларускаму Выбарнаму Камітэту — узмацуець ваўкоў і аслабіць вас саміх.

Верце мне, браты, а хочаце праканацца, пасылайце хадакоў у Вільню ў Беларускі Выбарны Камітэт. Калі-ж нічога ня будзеце рабіць, ня будзеце паказваць цікаўнасьці да агульнай справы, дык на кожным з вас гэта адабецца пасьля яшчэ горш, чымся было да гэтага часу.

Чытач „Крыніцы", стары беларускі селянін. Падпісацца на часе не магу.

✦✦✦✦

Старавэры — з Беларусамі.

11 верасьня адбыўся агульны сход стараверау Браслаўскага, Дунілавіцкага, Дзісенскага і Сьвянцянскага паветаў, на якім былі прадстаўнікі каля 40 стараверчаскіх грамадаў (абшчын). На гэтым сходзе разглядалі пытаньне аб учасьці ў выбарах у Сойм і Сэнат і выбралі дэлегацыю з 4 асоб, якой даручылі паехаць ў Вільню і тутака прылучыцца да тае выбарнае арганізацыі, якая маглабы найлепш забясьпечыць правы і здаволіць патрэбы стараверау.

Дэлегацыя, у склад якое ўваходзілі: Карп Жэлнін, Ерафей Васільеў, Савасьцян Міхайлаў і Сямён Лазарэў, адкінуўшы пасулы польскіх эндэкаў, пачала перагаворы з Беларускім Цэнтральным Выбарным Камітэтам.

На засяданьні сваім 16 верасьня Б. Ц. В. К-т прызнаў, што стараверы, хаця і рассыпаныя па розных акругох невялікімі групамі, становяць значную частку насяленьня нашага краю і павінны мець свайго прадстаўніка ў Сойме; дзеля гэтага Камітэт пастанавіў на сьпіску блёку нацыянальных меншасьцяў у Сьвянцянскім акругу аддаць старaверам адно з сваіх мейсц. Стараверы з свайго боку далучыліся да Камітэту і ўсе свае галасы пададуць за сьпісак блёку. Апрача таго прадстаўнікі стараверау Сьвянцянскага акругу абяцалі, што яны зьвернуцца да стараверскага насяленьня другіх акругоў, каб тыя гэтак сама падтрымлівалі сьпіскі Блёку.

На прыпадак, калі-б дэпутат стараверау не прайшоў на выбарах у Сойм, Камітэт абязаўся, што ўсе дэпутаты, якія пападуць у Сойм па сьпіскам Блёку з беларускіх акругоў, вязьмуць на сябе абарону правоў і інтарэсаў стараверскага насяленьня ўсяе Польшчы.

Мы горача вітаем гэтае аб'яднаньне з Блёкам нацыянальных меншасьцяў і тае часьціны расейскага насяленьня нашага краю, якой дагэтуль не абнімала агульна-расейскага прадстаўніцтва.

Адзначаем, што ў Горадзенскім выбарным акругу яшчэ раней стараверскае насяленьне далучылася да Беларускага Акружнага Выбарнага Камітэту, і прадстаўнік стараверау будзе тамака пастаўлены ў кандыдацкім сьпіску.

✦✦✦✦

Перад выбарамі.

Блёк Нацыянальных Меншасьцяў.

Ад 9 да 13 верасьня ў Варшаве адбывалася сэсія Аб'яднанага Выбарнага Камітэту Блёку Нацыянальных Меншасьцяў.

Камітэт займаўся пытаньнем аб падзеле дэпутацкіх мандатаў паміж зблёкованымі народамі.

Усе справы вырашаны згодна.

Гэтая згоднасьць вынікае з цьвердае сьвядомасьці ўсіх згуртаваных у Блёку нацыянальнасьцей, што толькі пры адзіным фронце „інародцам" у Польшчы можа ўдасца завяваць для сябе належнае мейсца ў Сойме і Сэнаце.

Сэсія зьліквідавала ўсё тое, што маглобы адбіцца на далейшай супольнай працы і Блёк стануў зканчальна на моцны і пэўны грунт.

Забрэзенскі Беларускі Выбарны Камітэт.

У м. Забрэзьзі, Валожынскага п., арганізаваўся Белар. Выбарны Камітэт. У склад Прэзыдыума ўваходзяць: Зінаіда Асіповіч, Міхал Станкевіч, Даніла Марзан, Мар'я Станкевіч і Сяргей Кананелька.

Камітэту падлягаюць тры гміны: Забрэзенская, Вішнеўская і Палачанская.

Па ўсіх абводах названых гмін, Камітэт арганізаваў Выбар. Кам.

Дзякуючы таму, што ў Абводавыя Камісіі папалі здраднікі, ці слугі панскія шмат жыхароў не запісана ў сьпіскі выбаршчыкаў. Гэта заўважана месцовымі Камітэтамі і зроблены адпаведныя захады.

Забрэзенскім Камітэтам арганізуецца некалькі мітынгаў, пасьля якіх будуць адбывацца беларускія прадстаўленьні, ладжаныя трупай, арганізаванай Камітэтам.

Роднае даражэй.

У мяст. Ярэмічах Навагрудскага пав. яшчэ да выбараў, быў закладзены камітэт польскай партыі „Вызваленьне", ў які ўвышлі тутэйшыя беларусы. Цяпер, як дачуліся аб працы Цэнтр. Белар.

Досьвіткі.

(Драматычныя сцэны.)

Сялянская хата. З пачатку хату асьвячае зарава пажару; пажар тухне і пасьля з другога боку уходзе сонца. Час-ад-часу чуваць далекі грукат гармат. У хаце, як перапужаныя авечкі, таўкуцца-запрыталіся сяляне. На ложку стогне хворы. Адна з кабет, гістаючы дзіцянятка на руках, вяе калысанку.

З ГРАМАДЫ: — Душна, цяжка дышаць, як пад лёдам.

— Як жывыя ў магілу закапаныя.

— Канец сьвету, канец сьвету...

— Пагінулі, прапалі...

— І як жыць, з чаго начаць...

— Гарматы грукацяць, а мне вылаецца, што я ляжу ў дамавіне і на мяне пясок кідаюць, кідаюць...

СЕЛЯНІН. (увышоўшы.) Кара Божая, кара Божая... Ад вёскі асталіся чорныя галавешкі, белыя комінымі дымам усё зьнікла! Толькі гэта хатачка адна адзюсенькая ўцалела, каб затуліць у сабе нас пакутнікаў, зьнідужаўшых ад бяды, мук...

ГАСПАДАР. Хай бы лепш і яна пажарышчам стала, чымся дачакаць гэткае папакоты.

З ГРАМАДЫ: — Не грашы, браце, Богу.

— А дзе твае яшчэ?

СЕЛЯНІН. Дзе мае... Жонка знаць ачумела, ні хацела што ратаваць, бо кінулася ў хату, — а страха ўжо гарэла. Дачка, енчучы з болю ўсё хадзіла каля вогнішча хаты і звала: „Мама! Мамачка!.." Ажно толькі цяпер выгарнулі яе костачкі... Я ня мог глядзець... А дачка білася аб зямлю, кляла і блюзьніла, аж пакуль шалёная куля і яе... Эх, чаму гэтая куля мяне абмінула!

З ГРАМАДЫ: — Як, дык і яна забіта?

— Бедная дзяўчына!

СЕЛЯНІН. Ох, браточкі мае, калі я згледзіў, як яе кроў дымілася на гарачым попялу побач стлеўшых костачак яе маці, дык так запякло, задрыжэла ў нутры. Крыўдна мне стала, моцна крыўдна. Камень грыз-бы са злосьці, помсты жадала сэрца... але ворага нідзе ня было... Ды й хто нам вораг?!

З ГРАМАДЫ: — Праўда, ўсё нам ворагі, ўсе нас пакінулі, як зблыканых авечак. Усё пабралі, паглумілі, праз век запрацаванае крывавым мазалём. Б'юць нас, зьдзекуюцца з нас, а што мы? А мы загнаныя ў казіны рог жальбуем толькі.

СЕЛЯНІН. (стаіць апёршыся на кіек, як бы сам да сябе) Хто нам вораг? Каб жа мы зналі, мо гурмам, грамадой далі-б яму рады, але кожны думае па своему, у кожнага іншы вораг, кожны сам сабе і ўсім вораг.

З ГРАМАДЫ: — Паны нам ворагі.

— Паны пабітыя ці паўцекалі, а на мейсцы двароў, ляжаць выгарэўшыя плямы, а з іх бароў і пушч ідзе за нашыя шнуры і агароды—лес ідзе.

— Грозным поступам лес ідзе.

— Мо лес наш вораг?

З грамады выступае кволы чалавек у бабскім каптане, скідаючы яго кажа:

КВОЛЫ ЧАЛАВЕК. Я ваш вораг... Наце, аддаю...

З ГРАМАДЫ: — Якім парадкам?

— Чаму ты нам вораг?

КВОЛЫ ЧАЛАВЕК. Як пачаўся пажар на вёсцы, дык я, гэтага, кінуўся вібы ратаваць ды ўскочыў, гэтага, ў Дамінікаву хату. Цапнуў, што папалася ў руку і ў кусты, гэтага. Думаю, калі ўсе забыліся на грэх, дык і я, гэтага, хоць пад старасьць вальней пажыву. Але папаўся мне вось гэты бабскі каптан. Пабег я да сваей хаты, а яе ўжо няма — згарэла... Так і астаўся ў каптане, прыкрыў гэтак ім шальмоўскую душу сваю... І каб вы суседзі палаілі, а то і пабілі, гэтага, мо палягчэла-б, а то ў серадзіне гатуецца, шчыміць, гэтага, як на дне пякельным... (некаторыя сьмяюцца. Чуваць стукат у вакно і крык).

ЗА ВАКНОМ: — Гляньце, гляньце коціцца на нас аграмадны камень, лясы ломіць, горы расьціскае, бажніцы крыша... Камень каціцца!.. Ах проста на нас!.. (прабуджаныя дзеці паднялі плач; усе устрывожыліся).

ЯРМІЛА. Зварьяцела баба... Панесла яна раз сваім сыном есьці ў лес, ажно глядзіць на вербе вісяць у бялізне тры дзяцюкі, вышчарыўшы зубы на месяц... Як пазнала, што гэта яе дзеці, дык і зьвіхнулася з розуму. А доўгі час яе сыны баранілі нашу вёску ад напасьці, далёка аб іх чутка пашла, цэлыя палкі ў бок зварачывалі... Ажно ўрэшце падказаў нехта...

З ГРАМАДЫ: — Ат, меліць языком, быццам людзі першы раз гэта чуюць.

— Лепш бы гэтага зусім ня чуць.

ЯРМІЛА. Ды я так, каб не маўчаць...

ВАРЬЯТКА. (з візгам убегае і зашчапляе дзьверы). Ай, ратуйце! Пакусаў ўсё маё цела. Трымайце дзьверы. Ен не Ярміла, а ваўкалака — перакідаецца ў рудого ваўка, пьець кроў людзкую. Сваіх пляменьнікаў паеў, маіх сынкоў і хоць асілкаў, але здужаў, але змог... Цяпер мяне хоча зьесьці, грызець дзьверы, лезе... ратуйце!

ЯРМІЛА. Ты, сука, што гэта на мяне брэшыш?

ВАРЬЯТКА. (выбягае, чутно яе крык) Ай! Камень коціцца, давіць, крыша... уцекайце уцекайце...

ЯРМІЛА. Ня верце, людцы! Нікога я, ніколі, ня выказываў. Ніякіх людзей я ня ем, ані ў ваўкалаку не перакідаюся. Гэта ёй проста папалася на язык маё прозьвішча, вось яна і чаўпець. Ня верце браточкі, прысягну вам што ня праўда.. Каб не зышоў з гэтага мейсца, каб не разьняў гэтых пальцаў, каб.., (маўчанка. Ярміла абводзе ўсіх вачыма, як бы шукаючы спагады, але ад яго адсовываюцца). Каб вы спрухнелі, чаго-ж вы маўчыцё, чаго ўцекаеце ад мяне, як ад напасьці якой. Вы той ашалелай верыце. а мне дык не! Плюю я на вас! Не баюся я нікога — га! бо нікога няма. Бог з бажніцы прагнаны, паны ў палацах падушаны, начальства разьбеглася, як мышы тручаныя, а вы ха-ха-ха... Плюю я на вас! Вось мне душна тут і я разьбіваю вакно, і не баюся нікога, бо я тут цар і бог і нічога вы ня зробіце. Ха-ха-ха як сьмяхотна тырчаць вашыя нямыя, перапужаныя твары? Чаго маўчыце, чаго прыціхлі, пабялелі, як нябожчыкі. Ну ем я людзей, ваўкалака я, душагуб, пью кроў дык што-ж? І вы будзеце есьці людзей, навет дзяцей сваіх, саміх сабе будзеце грызьці, ліха вашай галаве. Будзеце, кажу, калі

Беларусы, закладайце Выбарныя Камітэты, станьце у абароне сваіх правоў!

Выбар. Камітэту, дык перашлі на родную ніву і камітэт польскай партыі распаўся.

Свабода агітацыі.

У Вільні пад прадседацельствам дэлегата ўраду п. Романа, адбылося паседжаньне з прадстаўнікамі паліцыі, на якім была падчыркнута неабходнасць свабоднай агітацыі у час выбарнай чыннасьці.

Прадвыбарная „свабода".

— У г. Ваўкавыску паліцыя адабрала ад тутэйшага беларуса пекалькі намяроў нашае газеты „Бел. Звону" і, ня глядзючы на протесты, не аддала.

— У мяст. Турэц, Навагрудзкага павету паліцыя арыштавала беларуса Т., які раздаваў „Беларускі Звон" сялянам. Пратрымаўшы гадзін дзесяць, выпусьцілі на волю.

Калі пападаецца ў рукі паліцыянтоў беларуская прадвыборная літэратура, дык яны демонстратыўна нішчаць ле перад народам.

— У аўторак 12-IX ў 6 гадзін увечара паўнамоцнік Цантральн. Выбар. Белар. Камітэту Кольнер быў арыштаваны шпегам і заведзены ў V цыркул м. Вільні. Пераглядзеўшы ўсю літэратуру, якую ўзяў Кольнер у Камітэце, паліцыя выпусьціла Кольнера на волю.

З газэт.

Паны ня дрэмяць.

Газэта „За Свабоду" піша, што ў Горадзеншчыне буйна ідзе прадвыбарная агітацыя. Сяляне цьверда стаяць за Блёк Нацмэн. Менш., які спаткаў варожыя адносіны сярод польскіх груп. Кандыдаты, прадстаўленыя расейска-беларускімі групамі ў Выбарныя Камісіі, не прашлі -- іх адкінулі пад рознымі закідамі і прічэпкамі.

Абураючая вестка.

„Dziennik Wołyński" наведамляе, што ў гор. Луцку састаўлены сьпіскі выбаршчыкаў. З ліку 30000 жыхароў папала ў сьпісак толькі 6000.

З Савецкай Беларусі.

Сельска-гаспадарская выстаўка.

Народным Камісарыятам Земляробства прызнана неабходным заснаваньне сельска-гаспадарчай выстаўкі на Беларусі. Выстаўка адчыняецца не пазьней другой паловы верасьня.

Сельска-гаспадарчая асьвета.

Да гэтага часу на Беларусі маюцца 3 сельска-гаспадарчыя школы: у Марінай Горцы сельска-гаспадарчы тэхнікум, школы ў Чырвоным Беразе, ў Старым Барысаве і эвакуіраваная ў Маскву Вітабская лясная школа, якую маецца на мэце вярнуць назад на Беларусь.

Становішча школьнай справы ў гэтых навуковых установах да гэтай пары не наладжана і недастаткова арганізована. Самы тып навуковай установы заснованы толькі для Мар'інгорскага Тэхнікуму. Барысаўская і Чырвоно-Беражская школы працуюць да гэтай пары бяз усякага пляну. У зьвяз-ку з адчыненьнем сельска-гаспадарчага Інстытуту, прапануецца перагледзіць правілы аб Мар'іна Горскім тэхнікуме, бо трэці курс тэхнікуму ў бягучым навуковым годзе ня можа быць адчынен па тэхнічных прычынах. Народным Камісарыятам Земляробства парашано зьвярнуць асаблівую увагу на сельска-гаспадарчую асьвету на Беларусі.

Школьная справа.

Совнарком Беларусі злажыў сьмету на ўтрыманьне школ, якая аблічываецца ў 5 трыльёнаў руб. З прычыны цяжкага эканамічнага становішча Дзяржавы, сьмета не зацьверджана. Народны Камісарыят Асьветы вырашыў зьменшыць лік вучняў, якія ўтрымліваюцца на кошт Дзяржавы, да 87 працэнтаў. 67 прац. вучняў павінны самі сябе ўтрымліваць. Плата за навуку гэткая: ў першых клясах — 1 рубель золатам, у паследніх — 3 рублі золатам.

Перадача маёмасьці Археолёгічных інстытутаў.

Па хадайніцтву рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, Галоўнай Управай прафэсыянальнай асьветы Р. С. Ф. С. Р. адменены свае пастановы аб перадачы маёмасьці зачыняемых Археолёгічных інстытутаў у Смаленску і Вітабску-Маскоўскаму Унівэрсытэту. Маёмасьць будзе перададзена Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту.

Перавод эпіскапа Мелхісэдэка.

Па маючыхся вестках, Вышэйшая Царкоўная Управа пераводзіць эпіскапа Мелхісэдэка з Менску ў адну з далёкіх эпархіяў РСФСР. („С. Б.")

ЗАСТОЙ.

Апошні час у Вільні ўсе крычаць аб застоі. Пасаду безработным знайсьці страшэнна цяжка, а найчасьцей і зусім немагчыма. Новыя прадпрыемствы не адчыняюцца. Істнуючыя дагэтуль прадпрыемствы і фірмы патроху скарачываюць лік сваіх працаўнікоў. Гандаль ідзе добра толькі на гарэлку. Запраўды «пьяны бюджэт»

Рэшта-ж гандлёвых устаноў робіць кепскія справы і ўсе яны жалюцца на малыя абароты ў гандлю, сьцьверджаючы небывалы застой. Такім чынам, выразна, з кожным днём усё больш і больш, адзначаецца застой як у нашай, і бэз таго убогай прамысловасьці, таксама і ў гандлю, павялічываючи лік безработных.

Уціснутая ў кут „Крэсаў Усходніх" Вільня задыхаецца дзеля таго, што гандаль і прамысловасьць задушаны блізасьцей зачыненых граніц з ўсімі суседзямі. Там, сям ідзе кантрабандны гандаль з Расеяй ці то з Літвой, вось і ўвесь заграпічны гандаль Вільні. Вільня варыцца ў сваім ўласным саку, патроху заміра є і траціць вагу эканамічнага цэнтра ў краі.

Застой ужо цяпер стаў настолькі выразным, што каб ратаваць крытычны стан гандлю і прамысловасьці трэба было-б пільныя і рашучыя крокі і перад усім, як найхутчэй шырака адчыніць усе граніцы з суседзямі і спыніць „свойскі гандэль" зьнішчожыўшы сыстэму „прывілеяў" польскім фірмам, даюшчую магчымасьць толькі ім вясьці гандэль з заграніцай! Гэтая сыстэма створана хутчэй для пракармленьня зруйнаваных дворных паноў, як для карысьці краю.

Калі пільныя крокі ня будуць зроблены, дык Вільня ў эканамічным становішчы будзе усё больш заміраць, фірмы і далей будуць ліквідавацца, а безрабоцьце будзе яшчэ большае.

А дзе тыя залатыя горы, якія нам абецалі яснавяльможныя паны пры „wcieleniu" Вільні, да Польшчы?

Пу-га.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

Весткі з Лунінца.

У Лунінцы арганізаваўся Беларускі Паветовы Выбарны Камітэт Лунінецкага павету ў складзе: старшыня Мікалай Анцукевіч (Лунінец, Царкоўны зав. хата Перапёлкіна № 2), намесьнік старшыні Аляксандр Жук і сэкрэтар Юльян Мілеўскі.

Нарадовая дэмакрацыя (эндэкі) і блізкія да іх працуюць. Яны добра ведаюць, што сялянства галасоў сваіх не дасьць ім, бо селянін добра пачуў панскую ласку і апеку. Гэтае самае панства, якое паўлазіла бясправўна ў Выбарныя камісіі падзяліла на абводы так, што грамадзянін змушаны будзе хадзіць ў некатарых месцох аж за 20 вёрстаў, каб падаць свой голас. Ведама калі гаспадар пойдзе галасаваць, дык жонка застанецца дома хату даглядаць. Покуль гаспадар уходае туды і назад па 20 в., дык жонцы будзе ўжо позна галасаваць. А што ўжо казаць аб старых ці слабых здароўем, а ў часе непагоды дык справа зусім дрэнна наагул.

Напрыклад сялян у гор. Лунінцы запісалі ў сьпіскі выбаршчыкаў Бастынскага абводу, які ляжыць ад Лунінца 18 вёрст.

І так у кожнай гміне. Для нас беларусаў мабыць і закон ня пісан, бо ў выбарным законе ў артыкуле 12, пункце 2—сказана «каб ніводзін выбаршчык ня меў ад сваей аседласьці да будынку, ў якім будуць адбывацца выбары, больш як 6 кілометраў (5 з паловай вер.)»

У Лунінцы працу вядуць рожныя польскія партыі не выключаючы і партыі сацыялістаў (P. P. S.), якая абецаючы цяпер беларусам зямлю і волю не ў далёкім мінулым, ня глядзючы на нашыя вузкія шнуры, галасавала ў Сойме за то, каб польскіх жаўнераў надзяліць

нівы стаптаны, аруды пагарэлі, край зьнішчожаны, сьвет галодны, людзі азьвярэлі, а злое ўсюды пануе — патопам разьлілося, а пошасьць, паморак, як чад распаўзаюцца. Дык як жыць? У злым трэ шукаць паратунку, шатаном трэба стацца, хай вырастае воўчы клык... (узяўшыся за клямку ад дзьвярэй). Вы можа думаеце, што я ўцякаю ад вас, баюся вас. Плюю я на вас... Душна мне тут, цесна... (шпарка выходзе; доўгая маўчанка].

ХВОРЫ. Вось каб так ціха было, альбо каб смерць настала... Каб мяне ў касьцёл палажылі, там і паветра шмат, і сьвету, і ціха, ціха... А хараство сьценак і абразы паганялі бы думкі аб Богу, аб небе, аб шчасьці... Я-б там выздаравеў.

З ГРАМАДЫ: — Каб-жа сьмерць.

ХВОРЫ Найлепшая падзяка за жыцьцё, гэта спакойнае, бяз мук скананьне.

З ГРАМАДЫ. — Мама, мамачка дай есьці. Мамачка, есьці хачу.

З ГРАМАДЫ: Ціха ты дакука мая, нешчасьце маё, што я табе дам... (раптам прыгартае дзіця і плача). Супакойся дзетка маё родненькае. Мне яшчэ трудней, бо мушу разумець твой голад і сама галадаць. О, гора-ж маё, гора!

ГАСПАДЫНЯ. Ціхаце-ж, я падзялю страву хворага... Хай дзіцянё заморыць рабака. (Дастае з печы яду)

ХВОРЫ. Дай, дай... мне толькі абы супакой, цішыну.

КАБЕЦІНА. (Уваходзіць з дзіцянём на руках) Сьвяты чалавек! Сьвяты гэты наш вучыцель, дзе ён ступіць там і радасьць запануе.

З ГРАМАДЫ: Ну, што там такое?

— Дык ён ня ўцёк?

— Ну хіба-ж ня бачыў, як ён тушыў пажар.

КАБЕЦІНА. Выратаваў мне дзяцёнка, жыцьця не шкадуючы, выратаваў... Маю красачку, надзею...

З ГРАМАДЫ:—Дык чаго ж ты плачаш?

КАБЕЦІНА. Я і плачу, і сьмяюся, і жаль мне нейкі, і радасьць, як з Богам гукаля. Ён усім памагае—гэта сьвяты чалавек. Цяпер раненых даглядае, поіць, пацешае словам і чынам.. (чуваць шум матора; усе кінуліся да вакна).

З ГРАМАДЫ; — Арэпляж, арэпляж!..

— Дзе?

— Глядзі ўверх, правей...

— Вундзе, як павук паўзе па хмарцы.

— Бомбы мусіць кідае. Каб на нас ня кінуў.

— Хай бы ён лепш, лётаючы там каля сонца, сьвету нам кінуў.

— Ох калі гэтая крутаніна кончыцца, калі ўціхамірыцца. Няма жыцьця!

— Круціцца, меліцца, як на торжышчы якім.

— Крыўдна нам, крыўдна. Во хоць бы я: з багатага, семяністага гаспадара астаўся, як стой. Жабрак! Усяго таго багацьця—галоднае, халоднае жыцьцё.

— Церпім гора—мусіць гэтак трэба. Адно толькі цяпер прашу, каб супакоілася гэтае насланьнё, хвіля,

— Міру, міру!..

— Нашы дзеці дык і ня знаюць, што такое мір, спакойнае жыцьцё,

— Я, надойча, як хаваўся ад куль, прылёг у ямку. А кулі, значыць, нада мной роем пзынкаюць, хэ,хэ... А я паражагнаўся, утуліў галаву і ўзіраюся значыць на зямлю. Бачу адна, другая дзюрачка, а праз іх так і снуюць мурашкі. Адна, значыць, казяўку якуюсь валоча, другая траўку сухую—ну ведама кожная мае занятак, толькі вось я, думаю сабе, туляюся па ямах, як збойца, кінуў гаспадарку, сямью і за што, і на што? І жаль, значыць, мяне моцны агарнуў, сьлёзы як гарох пасыпаліся, хэ-хэ-хэ... да душы пасыпаліся, самахоць... (неўзнаку ўцерае сьлёзы). Ускочыў, значыць, я і стаў на відавоку, але ні адна куля не зачапіла—такі ўжо лёс. Хэ, хэ...

— Дык ня дзіва жывеш здаецца па людзку і бацькі Бога не гнявілі, а вось душа калоціцца ў трывозе, як пакутніца, як бы ўчыніў якісь страшны праступак.

Тут адзін з сялян, што спаў прысеўшы на' надлогу, ускочыў крычучы з прасонку.

ПРАБУДЖАНЫ. Стойце, ня біцеся! Пагібель на вашу партыю!

З ГРАМАДЫ: — Чаго ён? Што з ім стала?

— З прасонку пэўня.

ПРАБУДЖАНЫ. (ачуняўшы) Ох, дайце-ж рады. Толькі гэта вочы зажмурыш, як перад табой аратар так і тараторыць, так і камандуе рукамі. Сніў, што мяне прывязалі да слупа, бо я не хацеў слухаць, а тут кожнае слова гаворкі аратара як цэпам па галаве, як цэпам па галаве. Ох, ажно цяпер галава гарыць, покаецца ад болю, пал у грудзях, сэрца ныя, трапешчыцца...

З ГРАМАДЫ: — Усялякія партыі навыдумлялі. Які чорт ня вырвецца з падваротні ўсё новую партыю табе суліць, просіць запамогі, даданьня, падбухторывае на сваіх ворагаў і ўсе хочуць вайну толькі не паміж сабой, а з нашымі курамі ды парасятамі.

— Скубуць, як гарох пры дарозе.

— Здаецца ў лес бы ўцёк, у зямлю жывы палез, так усё надакучыла.

—І ніяк душа не прыймае, ў галаве ня тоўпіцца.

— Мукі! Акаяцілі душу. Цьфу!

— Я вам кажу, што гэта Антыхрыст прышоў, а яго прыхвастні каламуцяць жыцьцё і сьвет, хочаць зьбіць з панталыку, ачмуціць, а тады з нашым братам што хочыш рабі, хоць поле абнавозь.

— Адзін ратунак да споведзі схадзіць.

— Каб жа было каму спаведаць.

— Усе ў прочках.

(Канец будзе).

Лявон Жыцень.

зямлёй на якой беларус праліваў пот і кроў.

Андрэй З.

Места Докшыцы, пав. Дунілаўскаго.

У нашым глухім кутку да гэтага часу ціха і запуджана было ўсё. Здавалiся, што няма навет ніякай сілы прабудзіць вёску ад векавечнага сну. Інтэлігэнты былі надта русыфікаваны і навет некаторыя пачыналі хіліцца ў польскую старану.

Падышоў час агітацыі выбараў у Варшаўскі Сойм і Сэнат. Сталі рабіць наезды ўсялякія агенты польскіх партыяў. Сталі гэтыя няпрошаныя госьці абаламучываць і нашых сялян.

Але беларускія „адзінкі“ ужо ня выцерпялі і сталі хлапаціцца, каб дапамагчы тутэйшай беларускай справе. Але вось адазваўся Беларускі Цантральны Выбарны Камітэт у Вільні і голас яго тут пачулі і ўсе ажылі, павясялелі.

У нядзелю 10 верасьня зроблены мітынг, які быў добрым паказчыкам таго, наколькі тутэйшы беларус адзыўчыў да сваей роднай справы і з якім пачуцьцём ён слухае сваё праўдзівае слова.

Ня толькі цёмны сялянін тут пераканаўся, што трэба бараніць свае справы і што трэба галасаваць толькі за сваіх беларускіх прадстаўнікоў, але навет і тыя інтэлігэнты, што раней былі здраднікамі, каторыя рабілі зьдзек і навет гвалт чынілі беларускай справе і тыя прымкнулі да беларусаў і сталі працаваць па сваіх вёсках.

Тагды-ж быў закладзены Беларускі Выбарны Камітэт, у прэзыдыум каторага уваходзяць: Шашко Кастусь (старшыня), Шэсьцяршік Язэп (сэкрэтар, Муха Андрэй, Крыкун Юзік і Шэвель Мацей.

Камітэт гэты пачаў працу па вёсках, лежачых навакола м Докшыц.

Вялікая адчуваецца недастача газэт і наагул беларускай літэратуры.

Нінок.

СЯЛЯНЕ! Дамагайцеся сваіх школ у роднай мове. Састаўляйце прыгавары аб адчыненьні беларускіх школ. Зьвертайцеся за парадай і запамогай да Беларускай Цантральнай Школьнай Рады. Памятайце, што ў асьвеце—наша моц.

Што чуваць у сьвеці.

Вэнгрыя прынята ў Лігу Нацый.

На апошнім паседжаньні Лігі Нацый Вэнгрыя прынята ў лік сяброў Лігі.

Саюз усходніх народаў.

Газэты паведамляюць, што Турцыя хоча арганізаваць саюз усходніх народаў, які бараніў-бы ўсходнія інтарэсы ад эўрапэйскіх дзяржаў. У саюз маюць увыйсьці: Турцыя, Геджас, Ягіпет, Пэрсыя, Палестына, Сырыя, Туніс, Алжыр, Трыполі і Мароко.

Трывожнае становішча ў Эўропе.

Ангельскія газэты, разглядаючы сучаснае палітычнае жыцьцё Эўропы, адзначаюць яе трывожнае становішча, падобнае да 1914 г. Прадбачаць магчымасьць хуткай вайны.

На Балканах трывожна.

Грэкі пакінулі Канстантынопаль. Баўгарыя мабілізуе войскі і пасылае на грэцкую граніцу.

Туркі арганізуюць паўстаньні ў Фракіі і выступаюць з бурнымі дэманстрацыямі ў Канстантынопалі і Андрыанопалі.

Ідзе барацьба за карыстаньне Дарданельскіх праліваў паміж Англіяй, Францыяй, Італіяй, Расеяй і інш.

Грознымі падзеямі ўстрывожана і Румынія, якая думае склікаць канфэрэнцыю па пытаньню Блізкага Усходу.

Савецкі Урад трымае прыгатоўленымі да выступленьня войска на Каўказе і флота на Чорным моры.

Амэрыка прызнае паважным момэнтам паход туркаў на Эўропу.

Сэрбія пратэстуе проціў аддачы Канстантынопаля Турцыі.

Англійская Рада Міністраў вынясла пастанову зрабіць усё магчымае, каб не дапусьціць туркаў у Эўропу.

Каля выбараў у Польскі Сойм.

Газ. „Unz. Tog.“ паведамляе, што ў Вільні ў сьпіскі выбаршчыкаў не ўнесена 60 проц. з ліку жыдоў-выбаршчыкаў.

Жалезныя дарогі ў Віленшчыне.

Згодна праэкта каміс. грам. работ на Віленшчыне будзе праведзена 767 кілёмэтраў жалез. дарогі.

З Літвы.

Ідзе прадвыбарная агітацыя. Беларусы выстаўляюць свайго кандыдата ў Сойм Аляксандра Карабача.

ХРОНІКА.

20 верасьня па загаду Адздзела Прэсы віленская паліцыя канфіскавала 8 тысяч экзэмпляраў „Беларускага Звону“ № 20. У памешканьні Цантральн. Беларускага Выбарнага К-ту разам з газэтай забралі адозвы і інструкцыі.

У віленскіх газэтчыкаў забралі ня толькі сканфіскаваны номер, але і папярэдні № 19.

— У Вільні арганізаваўся вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам Фр. Аляхновіча. У хуткім часе тэатр выедзе на правінцыю.

— З Будслаўскай гміны паведамляюць, што абшарнік Аскерка, які валадае вялікімі абшарамі лясоў, вырубае ў пень усе лясы. Аб гэтым быў доказ уладзе,—прыежджалі кантралёры і чамусьці аб'ежджалі тыя мейсцы, дзе лес яшчэ стаіць і паехалі ні з чым. А лес і далей покатам сякуць.

— У Драматычнай Майстроўні. На апошнім паседжаньні Мастацкае Рады Майстроўні вырашана даручыць тэхнічнае кіраўніцтва сцэнічнай працай вучыцелю Беларускае Гімназіі гр. Міхалевічу, які працаваў у працягу некалькіх гадоў як рэжысэр і мае добрую тэорэтычную і практычную падгатоўку.

Моладзь ахвотна запісваецца ў Майстроўню. Пакуль што прынята 23 асобы. Сыстэматычныя заняткі для моладзі будуць складацца з лекцыяў (дэклямацыя, гісторыя тэатру, тэорыя грыму, рытмічныя рухі) і з практыкаваньняў—падгатоўкі спэктакляў. Дзеля таго, што сярод прынятых у Майстроўню ёсьць значная лічба дзяцей малодшага ўзросту, вырашана паставіць спэцыяльны дзіцячы спэктакль, арганізацыя якога даручана вучыцельцы беларускае гімназіі п. Альшоўскай.

На гэтых днях пачнецца разрысоўка залі, дзе будуць адбывацца спэктаклі Майстроўні (Вострабрамская, № 9). Разрысоўка будзе рабіцца працаўнікамі Майстроўні пад кіраўніцтвам мастака гр. Даўгяллы, па рысунках старасьвецкага Беларускага Мастацтва (слуцкія паясы), прыгатаваных гр. Л. Родзевічам.

— Беларускі мастак грам. Драздовіч ахфяраваў у Першую Віленскую Беларускую гімназію адзін з сваіх абразоў, які напісан масьлянымі фарбамі. Зьмест ўзят з часоў старасьвецкае Беларусі.

— Пачаўшыяся 2 верасьня г. г. ў Першай Віленскай Беларускай гімназіі занятткі, ідуць ўжо нармальным ходам. Запрошаны новыя пэдагогі: п. Зенкевіч (польская мова), атрымаўшы вышэйшую эканамічную адукацыю, п. Сьнежынскі (агульная гісторыя і гісторыя славянск. літэратуры), Архімандрыт Піліп, Рэктар Віленскае Духоўнае Сэмінарыі (Славянская мова), п. Міхалевіч (Нямецкая мова), п. Альшэўская (Француская мова).

Арганізуецца пазашкольная праца. Ужо пачалі працаваць: гурток па лацінскай мове, якім кіруець п. М. Красінскі (вольны пераклад Цэзара) і гурток па геаграфіі пад кіраўніцтвам п. Канчэўскага (экскурсіі, практыкаваньня па зьніманьню пляноў, гульні і інш.).

— 19 верасьня у Вільні адбылося урачыстае адкрыцьцё памятніка Ст. Манюшкі — бацькі беларускай Опэры.

У бліжэйшым номеры зьмесьцім падробнае апісаньне гэтай урачыстасьці.

— На днях выйдзе Новая Сусьветная Гісторыя пабеларуску. Выданьне Віленскага Выдавецкага Т-ва

— Ахвяры на „Бел. Звон“. Ад грам. Чэрвякова Мікалая 3000 м. п.

Беларускі дзіцячы прытулак.

За час ад 1. V да 1. IX г. г. атрыманы ахвяры на карысьць прытулку: Ад вучыцеля Кастуся Маеўскага—6.250 мар. польск., ад N—1000 мар., сабрана ў царкве Сьв. Тройцы 4.VI. 3704 маркі, в гульні „вудачка“ у Бел. Клюбе 19.VI 5100 мар. і за кветкі 2055 мар., ад вучыцеля Язэпа Шнаркевіча 7000 мар. і праз п. Жаўрыда 500 мар. Разам 25.609 мар. польск.

Беларускі Камітэт Помачы пацярпеўшым ад вайны складае ўсім ахвярадаўцам шчырую падзяку і зьвяртаецца да беларускага грамадзянства і наагул да людзей добрай волі з гарачай просьбай падтрымаць сваімі ахвярамі бедных беларускіх дзяцей-сірот і паўсірот, якія ў лічбе да сотні асобаў сабраны і гадуюцца ў прытулку, якім апякуецца Камітэт. Надыходзіць цяжкая для нашага прытулку зіма; даць дзецям мінімум харчаваньня без ахвяраў з правінцыі будзе немагчыма. Камітэт спадзяецца, што вучыцелі на правінцыі, духоўнікі праваслаўныя і каталіцкія, каапэратывы, гмінныя войты, шкадуючы бедных дзяцей, не адмовяцца прыняць на сябе ініцыятыву па зьбіраньню і перасылцы ахвяраў на карысьць прытулку. Ахвяры прысылаць на адрас: Вільня, Вострабрамская, 9.

Камітэт.

Бібліяграфія

Адраджэньне. Літэратурна Навуковы Весьнік Інстытуту Беларускае Культуры. Выходзіць чатыры разы на год. Сшыток першы. Рэдактар Я. Лёсік. Беларускае Каапэратыўнае Выдавецкае Т-ва. Менск, 1922 г. У рэцэнзіі, якая надрукована ў газ. «Савецкая Беларусь», №191 чытаем:

„Сваім выглядам часопіс робіць вельмі прыемнае уражаньне (330 страніц вялікага журнальнага фармату). Гэта — першая салідная па аб'ёму кніга на беларускай мове.

Праўда праграмнага артыкулу ад радакцыі, ўступу, што пры такіх выпадках абавязкова трэба было даць — няма, але гэта з поўбяды: зьмест кнігі сам за сябе гавора. Кніга дзеліцца на дзьве часткі: 1) Прыгожае пісьменства і II) Навуковы аддзел.“

У частку прыгожага пісьменства уваходзіць: Адрывак з паэмы „Новая Зямля“ Я. Коласа. Гэты эпічны твор памянёная рэцэнзія называе кульмінацыйным пунктам творчасьці Якуба Коласа.

„У Палескай гушчы“, аповесьць Я. Коласа.

«Перад будучынай» вершЯнкі Купалы. «Кароткі верш вялікай натхнёнасьці і біблійнай стылізацыі“. („Сав Бел.“ № 191) Далей ідуць апаведаньні Яна Баршчэўскага у перакладзе Я. Лёсіка, паэма „Крылан“ Міхайлы Грамыкі, нясконченыя творы К. Каганца і інш.

У навуковы аддзел уваходзяць стацьці па пытаньнях розных галін навукі. „Беларускія Народныя Творчасьці“ —Паўла Каравая. „Максім Багдановіч як стылізатар беларускага верша“, — Ул. Дзяржынскага. „Слаўніковая праца ў беларускай мове,“ М. Байкова. Пасьмертныя успаміны аб Ядвігіну Ш. і Бурбісу А. напісаныя В. Лёсік і П. Бодуновай і іншае.

Ул. Ігнатоўскі. „Матывы лірыкі беларускага паэты М. Чарота.“ Дзяржаўнае выдавецтва Менск.

Уражаньні з мейсц.

Угаварываеш людзей, каб усе йшлі галасаваць.

— Дзе там, адказываюць, ісьці усім. Адзін гаспадар пойдзе і ўкіне намяры за ўсю сямью.

— Не, дарагія, так закон не дазваляе.

— Ат, што там закон! Вунь бывала на выбарах у Віленскі Сойм, дык кідалі колькі душа жадала і за жонку, і за дзяцей. Навет сама камісія, што стаяла пры скрыначцы, давала білецікі і казала кідаць.

Што сказаць на гэта?

І дзе зарука, што цяпер так ня будзе?

В.

Адрасы Беларускіх Выбарных Каміт.

Цантральны выбарны Камтэт. Вільня, Віленская № 12.

Акружны Выб. Камітэт на Навагрудзкі акруг, Баранавічы, Паштовая № 66.

Акружны Выб. К-тэт на Лідзкі акруг Ліда, Легіёновая вуліца № 1.

Акружны Выб. К-тэт на Гарадзенскі акруг. Горадня, Паўночная вул. № 7.

Акружны Выб. К-тэт на Беластоцкі акруг. Ваўкавыск, Пясковая вул. № 14

Навагрудзкі Паветовы Выб. К-тэт. Навагрудак, Вялікі рынак № 14

Бельскі Паветовы Выб. К-тэт Бельск, Літоўская вул. № 30

Несьвіжскі Паветовы Выб. К-тэт Несьвіж, Альбянская вул. № 30

Слонімскі Паветовы Выб. К-тэт. Слонім, Абалонь № 42

Пружанскі Паветовы Выб, К-тэт Пружаны

Стаўпецкі Паветовы Выб. К-тэт Стаўпцы.

Аўгустоўскі Паветовы Выб. К-тэт Аўгустова

Сакольскі Паветовы Выб. К-тэт Саколка

Сэйнскі Паветовы Выб. К-тэт Сэйны.

Лунінецкі Паветавы Выбарны Камітэт. Лунінец, Царкоўны заулак № 2.

Вялейскі Паветавы Выбарны Камітэт. Вялейка.

Рудомінскі Гмінны К-тэт м. Рудоміна. Віленскі павет.

Шаркаўшчызненскі Гмінны К тэт м. Шаркаўшчына Дзісенскага павету.

Докшыцкі Гмінны Выбр. К-т. Докшыцы, Дунілавіцкага п.

Забрэзкі Гмін. Выбр. К-т. м. Забрезье, Валожынскага пав.

Ганчарскі Гмін. Выбр. К-т. Вёска Ганчары, Лідзкага пав.

Беліцкі Гмін. Выбар. К-т. Вёс. Збляны Лідцкага пав.

Орлянскі Гмін: Выбр. К-т. м. Орля Лідзкага пав.

Ржанкоўскі Гмін. Выбр. К-т. Вёс. Ракавічы Лідзкага пав.

Будслаўскі Гмінны Выбарны Камітэт Будслаў, Дунілавіцкага павету.

Негневіцкі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Негневіца, Лунінецкага пав.

Шчорсаўскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Шчорсава, Лунінецкага пав.

Любчанскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Любчаны, Лунінецкага пав.

Уселюбскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Уселюбы, Лунінецкага пав.

Городэчэнскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Городэчна, Лунінецкага пав.

Кашэлеўскі Гмінны Выбарны Камітэт. Вёска Кашэлева, Лунінецкага пав.

Лістападзкі Абводавы Выбарны Камітэт. Вёска Лістапады, Ашмянскага павету.

Запрудзкі Абвадовы Выбарны Камітэт. Вёска Вялікае Запрудзьдзе, Ашмянскага павету.

Кашчэлічскі Абвадовы Выбарны Камітэт Вёска Кашчэлічы, Ашмянскага павету.

Старынкаўскі Абводавы Выбарны Камітэт Вёска Старынкі, Ашмянскага пав.

Ганьковічскі Абводавы Выбарны Камітэт. м Ганьковічы, Ашмянскага павету.

Рудзяншчынскі Абводавы Выбарны Ка-т. Вёска Рудзяўшчына, Ашмянскага п.

Высокаўскі Абводавы Выбарны Камітэт. Вёска Высокае, Ашмянскага п,

Малазапрудзкі Абводавы Выбарны Ка-т. Малое Запрудзьдзе, Ашмянскага п.

Чытайце, распаўсюжывайце і шануйце сваю газэту.

Рэдактар-Выдавец Ф. АЛЯХНОВІЧ.

Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.